# СВЯТА САВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

## Ф. СУРГАНАЎ

### Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

З пачуццём велізарнай гордасці за сваю сацыялістычную Айчыну, за родную Камуністычную партыю адзначаюць савецкія людзі знамянальную дату — Дзень Канстытуцыі СССР. Гэта вялікае свята ўсіх брацкіх народаў Краіны Саветаў, якія ў дружнай, раўнапраўнай сям'і будуюць камунізм.

Трыццаць пяць год мінула з таго часу, як Надзвычайны восьмы з'езд Саветаў зацвердзіў Канстытуцыю СССР. Яна знамянуе сабой адну з найвялікшых сацыяльных заваёў Кастрычніка — перамогу дэмакратыі новага тыпу, сапраўднага народаўладдзя. Пад жыватворным святлом ідэй Леніна, увасобленых у Канстытуцыі СССР, расквітнела наша Радзіма, узнялася на небывалыя вышыні дзяржаўнага, эканамічнага і культурнага развіцця.

У яркім сузор'і саюзных рэспублік вялікіх поспехаў дасягнула і Савецкая Беларусь. Воляй і працай рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і пры брацкай дапамозе ўсіх народаў СССР наша рэспубліка ператварылася ў квітнеючы край з магутнай індустрыяй, з высокаразвітай сельскай гаспадаркай і перадавой культурай.

Беларускі народ сваёй самаадданай працай уносіць дастойны ўклад у агульную справу стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. Дастаткова сказаць, што толькі за гады мінулай пяцігодкі аб'ём прамысловай прадукцыі вырас на 80 працэнтаў. Апераджальнае развіццё атрымалі найбольш прагрэсіўныя галіны, якія вырашаюць справу навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. Аб'ём валавой прадукцыі ў калгасах і дзяржгасах павялічыўся за гэты перыяд на 45 працэнтаў, а прадукцыйнасць працы — на 50 працэнтаў.

Значна павысіўся ўзровень матэрыяльнага і культурнага жыцця працоўных горада і вёскі.

Дзень Канстытуцыі СССР сёлета савецкі народ адзначае ў абстаноўцы велізарнага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, які падвёў вынікі шматграннай дзейнасці партыі і стваральнай працы савецкіх людзей, вызначыў дакладную і ясную праграму далейшага эканамічнага, сацыяльнага і палітычнага развіцця нашай краіны.

Галоўная задача дзявятай пяцігодкі, сфармуляваная XXIV з'ездам партыі, заключаецца ў тым, каб забяспечыць значны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове высокіх тэмпаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, навукова-тэхнічнага прагрэсу і паскарэння росту прадукцыйнасці працы. Гэты курс партыі не толькі на перыяд дзевятай пяцігодкі, але і на працяглую перспектыву.

У нашай рэспубліцы аб'ём прамысловай прадукцыі намячаецца павялічыць за пяцігоддзе на 58 працэнтаў, сярэднегадавая валавая вытворчасць прадукцыі ў калгасах і саўгасах павінна ўзрасці на 41 працэнт. Будзе працягвацца хуткае развіццё энергетыкі, хіміі і нафтахіміі, машынабудавання і прыборабудавання. Выпрацоўка электраэнергіі ўзрасце да канца пяцігодкі ў 1,8 раза, хімічных валокнаў — у 2,7, прыбораў і сродкаў аўтаматызацыі — у 2,8 раза. Вялікая ўвага ўдзяляецца вытворчасці тавараў народнага спажывання. Толькі звыш плана за пяць гадоў калектывы прамысловых прадпрыемстваў абавязаліся выпусціць іх на мільярд рублёў.

Высокія рубяжы намецілі працаўнікі сельскай гаспадаркі. За пяцігодку прадугледжваецца павялічыць вытворчасць у калгасах і саўгасах мяса — у 1,5 раза, малака — у 1,4, яек — у 1,9 раза.

Працоўныя Беларусі, як і ўвесь савецкі народ, з вялікім уздымам і натхненнем працуюць над практычным ажыццяўленнем гэтых вялікіх і адказных задач. З усіх канцоў рэспублікі ідуць радасныя весткі аб працоўных поспехах. Яны сведчаць аб тым, што новая пяцігодка стартавала паспяхова. Работнікі прамысловасці перавыканалі план адзінаццаці месяцаў гэтага года па рэалізацыі прадукцыі і выпуску большасці важнейшых відаў вырабаў. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрос амаль на 12 працэнтаў. Выкананы план па росту прадукцыйнасці працы. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў змагаюцца за выкананне плана першага года пяцігодкі ў цэлым па прамысловасці да 26 снежня і па росту прадукцыйнасці працы — да 25 снежня.

Добрых вынікаў у першым годзе дзевятай пяцігодкі дабіліся і работнікі сельскай гаспадаркі. У рэспубліцы ўпершыню сабраны ўраджай збожжавых амаль па 22 цэнтнеры з гектара, што дало магчымасць прадаць дзяржаве больш за 670 тысяч тон збожжа, у тым ліку больш як 170 тысяч тон звыш цвёрдага плана. Паспяхова выконваюцца заданні па нарыхтоўцы мяса. Больш плана прададзена дзяржаве яек, воўны, бульбы і садавіны.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы